# СЛОВА ЧЫТАЧА

Зусім заслужана творчасць пролетарскага паэта Андрэя Александровіча карыстаецца вялікай павагай з боку працоўнага чытача. Па аднэй толькі бібліятэцы імя А.С.Пушкіна (Менск) у сярэднім Александровічавых кніг чытаюць да 10 у дзень. За апошні месяц Александровічавы творы прачыталі "Напор" -- 61 чал., "Цені на сонцы" -- 193, "Нараджэнне чалавека" -- 18, "Гудкі" -- 24 чал. і г.д. Шмат чытаюць і крытычнай літаратуры пра А.Александровіча.

Надзвычайнай папулярнасцю карыстаецца А.Александровіч сярод дзяцей. Яго паэма "Шчаслівая дарога" стала вядомым творам, яна чытаецца сотнямі юных чытачоў, якія даюць свае вельмі станоўчыя ацэнкі.

Так, дванаццацігадовы піонер І.Гарміза піша:

"Паэма "Шчаслівая дарога" мне вельмі спадабалася. Вершы напісаны складна і зразумела, простай мовай. Мне вельмі спадабаўся жыццёвы шлях Грышкі, які вырваўся са шкоднага кулацкага ўплыву і пачаў будаваць сацыялізм"...

Вучань 27-й школы Файвішаў адзываецца пра "Шчаслівую дарогу" так:

"Асабліва мне ў гэтай кніжцы спадабалася, як Грышка выдаў сваю сястру начальніку пагранатрада. Раю ўсім гэту кнігу прачытаць"...

Сур"ёзную ацэнку гэтай кнізе дае вучань 6-га класа 5-й школы Фрыдман:

"Кніга мне вельмі спадабалася таму, што Александровіч здолеў правільна паказаць, як савецкая ўлада перавыхоўвае дзяцей, якія трапляюць пад уплыў класава-варожага элемента.

Хлопчык Грыша -- сын кулака, становіцца добрым вучнем савецкай школы. Кніжка для нас важна таму, што яна знаёміць нас як жывуць пагранічнікі і як яны абараняюць нашы межы".

Вучань 5-га класа Хенкін наступнымі радкамі адклікаецца на "Шчаслівую дарогу":

"Аўтар паказвае ў сваёй кнізе, як сын кулака жыў і вучыўся з дзецьмі пагранічнікаў. Спачатку ў Грышкі моцны былі кулацкія замашкі (украў у настаўніка піпку, не хацеў паказаць дзяўчынцы Наце свой канспект таму, што сам імкнуўся стаць самым лепшым вучнем). Раней Грышка яшчэ не разумеў сутнасці класавай барацьбы. Але Грышка перавыхоўваецца і аўтар паказаў адзін толькі добры ўчынак Грышкі. Паўстае пытанне: чаму аўтар не паказаў больш добрых учынкаў? Пра гэта я так не даведаўся".

Такім чынам, водгукі гэтых не проста чытачоў, а і крытыкаў яшчэ раз падкрэсліваюць, што творы Андрэя Александровіча натхняюць да адданай работы на ўсіх франтах будаўніцтва бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Н.Ельяшкевіч,

П.Кавалёў.